# ТЭОРЫЯ, МЕТОДЫКА І АРГАНІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

УДК 37.017.4:069.12-053.6

*В. І. Мазалеўскі*

## Маральнае выхаванне дзяцей у музейнай прасторы пры дапамозе тэатралізаванай экскурсіі

*Разглядаецца методыка фарміравання маральных каштоўнасцей моладзі. Адным з варыянтаў рашэння прапануецца музейная тэатралізаваная экскурсія, у якой педагог-экскурсавод стварае мастацкі вобраз, заснаваны на музейных артэфактах экспазіцыі дзяржаўнай установы «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж"». Экспанаты, якія знаходзяцца ў музейнай экспазіцыі, суправаджаюцца тлумачэннямі, звязанымі з сямейнымі ці асабістымі ўспамінамі, якія з'яўляюцца больш суб'ектыўнымі, чым дакументальнымі. Асабістыя ўспаміны захоўваюць вобраз пэўнай гістарычнай падзеі, як у мемуарнай літаратуры. Экскурсавод стварае вобраз асобы, гістарычнай падзеі ці культурнай практыкі, а як элемент тэатральнасці можа быць выкарыстана вакальная музыка.*

У сучасных умовах прыярытэтнай задачай грамадства ў сферы выхавання падрастаючага пакалення з'яўляецца развіццё высокамаральнай асобы, якая падзяляе беларускія традыцыйныя маральныя каштоўнасці. У гісторыка-педагагічных даследаваннях, прысвечаных тэарэтычным праблемам маральнага выхавання, як правіла, вылучаюцца ідэі і погляды асобных педагогаў, якія раскрываюць іх пункт гледжання на пэўнае кола педагагічных праблем.

Са старажытных часоў у педагогіцы вывучалася роля маральнага выхавання ў развіцці і фарміраванні асобы. Шматлікія выбітныя педагогі мінулага адзначалі, што падрыхтоўка добразычлівага чалавека не можа зводзіцца толькі да яго адукацыі і разумовага развіцця, і на першы план ставілі маральнае выхаванне. У трактаце «Настаўленне нораваў» Я. А. Каменскі цытаваў Сенеку, які пісаў: «Навучыся спачатку добрым норавам, а затым мудрасці. Бо без першага цяжка навучыцца апошняй»* [3, с. 340].

Вялікую ролю адводзіў маральнаму выхаванню І. Г. Песталоцы. Педагог адзначаў, што толькі маральнае выхаванне фарміруе дабрадзей-

* Цытаты даюцца ў перакладзе аўтара артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны характар, стойкасць у розных жыццёвых няўдачах і спачувальнае стаўленне да людзей [5].

Аб вядучай ролі маральнага развіцця падрастаючага пакалення пісалі М. А. Бярдзяеў, В. Р. Бялінскі, Л. М. Талстой, М. І. Пірагоў, К. Дз. Ушынскі і інш.

М. І. Пірагоў у артыкуле «Пытанні жыцця» абгрунтоўвае ідэю агульначалавечага выхавання, якому павінна папярэднічаць спецыяльная адукацыя. Незалежна ад талентаў і схільнасцей кожнае дзіця павінна стаць чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова. Для гэтага неабходна даць дзецям перш за ўсё гуманітарную адукацыю. Пад гуманітарнымі ведамі педагог разумее веды, неабходныя для кожнага чалавека, веды, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і застаюцца назаўжды «ліхтарамі» на шляху жыцця. З гэтым цяжка не пагадзіцца, бо менавіта гуманітарныя навукі дазваляюць выхаваць асобу, уздзейнічаць на маральныя якасці чалавека.

Такім чынам, пастаўленыя мэты выхавання патрабуюць пэўных умоў: па-першае, дзіця павінна мець інтэлектуальныя задаткі і здольнасць адчуваць, «мець ад прыроды розум і пачуццё»; па-другое, неабходна даць свабоду для развіцця гэтых задаткаў. Трэцяй неабходнай умовай выхавання сапраўднага чалавека з'яўляецца рэлігійнае выхаванне, якое закладвае маральную аснову асобы, надае сэнс існаванню.

Чалавек на працягу жыцця стаіць перад пытаннем – хто ён такі? І адзіны спосаб даведацца – гэта зазірнуць у сваю душу, спазнаць «чалавека ўнутры сябе». М. І. Пірагоў лічыць, што для самавыхавання неабходна самасвядомасць [6].

Найбольш поўна і ярка характарызаваў пераўтваральную ролю маральнага выхавання ў развіцці асобы К. Дз. Ушынскі. Ён пісаў, што «аднаго розуму і адных спазнанняў яшчэ недастаткова для ўкаранення ў нас таго маральнага пачуцця, таго грамадскага цэменту, які часам згодна з розумам, а часта і ў супярэчнасць з ім, звязвае людзей у сумленнае, дружнае грамадства» [8, с. 429]. Педагог дае канкрэтныя рэкамендацыі па маральным выхаванні. Пачуцці, жаданні, воля – вось асноўныя яго інструменты. Выхаванне пачуццяў і жаданняў павінна быць свабодным, але злучаным з кантролем з боку выхавальнікаў: «...самыя бесхарактарныя людзі выходзяць з тых сем'яў, дзе бацькі і выхавальнікі, не разумеючы ўласцівасцей душы чалавечай, няспынна ўмешваюцца ў жыццё дзіцяці і не даюць яму свабодна ні адчуваць, ні жадаць» [9, с. 319].

Велізарную ролю маральнага выхавання ў працэсе навучання і фарміравання асобы адзначаў В. Р. Бялінскі. Ён лічыў, што адукацыя і набываемыя чалавекам веды і ўменні прынясуць большую ці меншую карысць у залежнасці ад таго, якую маральнасць ён засвоіць. «Ёсць шмат родаў адукацыі і развіцця і кожны з іх важны сам па сабе, але ўсіх іх вышэй павінна стаяць адукацыя маральная», – піша В. Р. Бялінскі і далей



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падкрэслівае, што адна адукацыя робіць чалавека вучоным, другая – свецкім, трэцяя – адміністратарам, ваенным, палітычным дзеячам і г. д., але маральная адукацыя робіць чалавека проста Чалавекам [2, с. 12]. Выказванні В. Р. Бялінскага аб шляхах і сродках маральнага выхавання глыбокія і змястоўныя. Асноўнае патрабаванне, па В. Р. Бялінскаму, заключаецца ў тым, каб засцерагчы дзяцей ад усяго благога, паставіць перад іх вачыма станоўчыя прыклады.

Вельмі высока ацэньваў маральнае выхаванне Л. М. Талстой: «З усіх навук, якія павінен ведаць чалавек, самая галоўная ёсць навука аб тым, як жыць, робячы як мага менш зла і як мага больш дабра» [7, с. 496]. У артыкулах Леў Мікалаевіч імкнуўся вызначыць мэты, змест, метады навучання і выхавання, зыходзячы з неабходнасці фарміравання творчага мыслення і маральнай самасвядомасці. Асэнсаванне духоўнага, маральнага станаўлення і развіцця чалавечай асобы з'явілася асновай усёй спадчыны пісьменніка.

Важную ролю ў выхаванні маральнасці як асновы грамадзянскасці і пераемнасці пакаленняў адыгрывае веданне гісторыі і культуры роднага краю, горада. Немагчыма навучыць любові да Радзімы толькі па кнігах, фарміраванне маральна развітой асобы актыўна адбываецца тады, калі дзіця далучаецца да грамадскіх каштоўнасцей, ідэалаў, традыцый [1].

Менавіта музей дазваляе ўсебакова вывучыць пэўную тэрыторыю, спазнаць маральныя і патрыятычныя традыцыі краіны. Музей як культурная форма, гістарычна выпрацаваная чалавецтвам для захавання, актуалізацыі і трансляцыі наступным пакаленням каштоўнай часткі культурнай спадчыны, закліканы заняць адно з вядучых месцаў у фарміраванні маральна-каштоўнасных арыентацый сучаснага чалавека [4, с. 119].

Нягледзячы на шэраг навуковых прац па праблеме маральнага выхавання дзяцей, варта адзначыць, што вывучэнне гэтага феномену ў музейнай прасторы знаходзіцца на пачатковай стадыі.

Сучасны музей не стаіць на месцы, ён змяняецца, развіваецца. Здавалася б, у працы з музейным наведвальнікам ужо немагчыма вынайсці нешта новае. Але досыць нядаўна была ўведзена абсалютна наватарская форма працы па прыцягненні наведвальнікаў у музеі – тэатралізаваная экскурсія. У далейшым гэтая практыка распаўсюдзілася і ў іншых сферах культурнай арганізацыі вольнага часу.

Тэатралізаваная экскурсія – гэта незвычайны спосаб правядзення вольнага часу з карысцю і задавальненнем. Такі від экскурсіі ператварае слухачоў не толькі ў гледачоў, але і ў непасрэдных удзельнікаў падзей. Гэта ўнікальнае спалучэнне інтэрактыўнай формы з дынамічнай і эмацыянальнай падачай самых цікавых фактаў з гісторыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жанр тэатралізаванай экскурсіі развіўся не толькі ў музеях і выставачных залах, але і ў рамках пешых гарадскіх экскурсій. Такія тэатралізаваныя гарадскія экскурсіі звычайна праходзяць у гарадах з багатай гісторыяй – Мінску, Віцебску, Полацку, Магілёве і Нясвіжы, а калі і ў іншых гарадах, то не атрымліваюць належнага асвятлення сродкамі масавай інфармацыі.

Дадзеныя экскурсіі як азнаямленчыя разлічаны на гасцей горада, якія хочуць даведацца аб яго гісторыі і культуры, але не турбаваць сябе вялікай колькасцю цяжказапамінальнага матэрыялу, насычанага датамі і імёнамі, якія ў большасці выпадкаў роўным лікам нічога не кажа экскурсантам. Такім чынам папулярнасць дадзенай формы набывае моц.

Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» прапануе тэатралізаваную экскурсію як унікальную магчымасць пабачыць падзеі з гісторыі Нясвіжа і роду Радзівілаў вачыма людзей, якія рэальна існавалі, жылі ў той ці іншай эпосе беларускай дзяржавы; атрымаць усплёск незвычайных эмоцый, адчуць і прапусціць праз сябе тое, што перажывалі яны: каханне, нянавісць, рэўнасць, пакуты, галечу, ганарыстасць і г. д. – усё тое, што ўласціва кожнаму, але выяўляецца пасознаму ў залежнасці ад часу і сітуацыі.

Тэатралізаваная экскурсія перад традыцыйнай агляднай мае шэраг пераваг:

– незвычайны турыстычны і экскурсійны фармат;

– паўнавартасная тэатралізаваная гісторыя па ўсім маршруце экскурсіі;

– інтэрактыўнае ўзаемадзеянне з гледачом, які становіцца ўдзельнікам падзей;

– калектыў прафесійных акцёраў і рэжысёраў, арыгінальныя сцэнарыі;

– падача інфармацыі праз рэальныя гісторыі і цікавыя факты.

Падчас правядзення тэатралізаванай экскурсіі «Імяніны ў замку Радзівілаў», што праводзіцца ў Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж», дзеці гуляюць у старажытныя беларускія гульні і забавы, даведваюцца, што азначаюць іх імёны, як святкавалі імяніны іх продкі, хто такія хросныя бацькі. Юных гасцей суправаджаюць князь, княгіня і маршалак, якія знаёмяць з укладам жыцця ў княскім замку, з традыцыямі святкавання імянін Радзівіламі. Імяніннік прымае ўдзел у цырымоніі паднашэння падарунка князю і сам атрымлівае падарунак ад музея-запаведніка «Нясвіж», а затым разам з гасцямі адпраўляецца на пачастунак да княгіні.

Тэатралізаваная экскурсія прадугледжвае працу з музейнымі прадметамі. Экспанаты, на якія звяртаюць увагу персанажы князя і княгіні, суправаджаюцца тлумачэннямі, расказваецца, якую ролю яны ігралі ў эпоху IX ардыната нясвіжскага князя Міхала Казіміра Радзівіла



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і яго жонкі Францішкі Уршулі Радзівіл з Вішнявецкіх, якім чынам яны звязаны з сямейнымі ці асабістымі ўспамінамі. Выкарыстоўваецца важны падыход – сфарміраваць аб'ектыўнае ўяўленне пра людзей і эпоху. Аб'ектыўнае становіцца дакументальным, гэта значыць валодае дамінуючай выхаваўчай сілай. Калі музейны прадмет сваёй прыналежнасцю матэрыяльна «пацвярджае» гістарычная падзея, то асабістыя ўспаміны захоўваюць яе вобраз, падобна да мемуарнай літаратуры. Такім чынам, грунтуючыся на асабістых сведчаннях, перапісцы, успамінах, звязаных з музейным экспанатам, экскурсаводы, якія выступаюць у ролі гістарычных асоб, ствараюць вобраз гістарычнай падзеі, асобы ці культурнай практыкі.

Асablівасцю ствараемага вобраза з'яўляецца максімальная аўтэнтычнасць экспазіцыі, у якой плануецца яго дэманстрацыя. Іншымі словамі, вобраз павінен змяшчаць усе характарыстыкі музейнага экспаната: па-першае, інфармацыю аб статусе ўладальніка і, па-другое, прыналежнасць да гістарычнай эпохі. Перадаючы праз вобраз духоўныя каштоўнасці, экскурсавод, які выступае ў ролі гістарычнай асобы, аднačасова з'яўляецца і яго ствaральнікам, і дэманстратарам. Ён павінен даць неабходныя тлумачэнні аб спецыфіцы пэўнага нематэрыяльнага экспаната, ужываючы экскурсійныя методыкі і прыёмы. Важна падкрэсліць, што гэта не экскурсавод-тэхнолаг, які «механічна» аднаўляе загадзя падрыхтаваны матэрыял, а экскурсавод-педагог, здольны перадаць педагагічны патэнцыял эпохі. Дзякуючы педагагічнаму майстэрству экскурсавода адбываецца матэрыялізацыя адлюстравання падзеі, практыкі і, дзякуючы экскурсійным методыкам, выконваецца прынцып нагляднасці.

У тэатралізаванай экскурсіі «Імяніны ў замку Радзівілаў» ужываюцца функцыі, як і ў любым культурна-забаўляльным мерапрыемстве:

– адукацыйная (дзеці даведваюцца аб значэнні сваіх імёнаў, прызначэнні хросных бацькоў і аб тым, як святкаваліся дні нараджэння нашымі продкамі);

– пазнавальная (дзеці знаёмяцца з цікавымі фактамі з гісторыі і культуры Беларусі з вуснаў першых асоб);

– забаўляльная і рэкрэацыйная функцыі (прадстаўлены найбольш выразна. Толькі ўявіўшы сабе, што ў дзень нараджэння цябе будзе суправаджаць сам князь Міхал Казімір Радзівіл, па мянушцы Рыбанька, з жонкай Францішкай Уршуляй, адразу адпадае пытанне аб аспектах забавы ў экскурсіі).

Тэатралізаваная экскурсія з'яўляецца новым відам культурна-забаўляльных мерапрыемстваў, які неабходна адрозніваць ад экскурсіі з элементамі тэатралізацыі. Тэатралізаванай экскурсіі ўласціва цэласнасць мастацкага вобраза, што ствараецца персанажамі, якія развіваюць тэму пэўнага мерапрыемства. На стварэнне такога вобраза пакладзены сілы не толькі акцёраў. Вялікае значэнне мае афармленне экскурсіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Касцюмы акцёраў не павінны выбівацца з агульнай стылістыкі і тэмы праграмы. Музыка і пэўны рэквізіт, самыя разнастайныя сродкі служаць для дасягнення адзінства вобраза экскурсіі. Гэта могуць быць і традыцыйныя пачастункі, і розныя абрады, і рытуалы.

Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі, як правіла, не ўласціва адзінства сюжэта. Але адрозненнем ад традыцыйнай экскурсіі з'яўляецца наяўнасць акцёраў.

Такім чынам, паўнавартасная тэатралізаваная экскурсія будуецца па тых жа прынцыпах, што і любы іншы від культурна-забаўляльных мерапрыемстваў. Асноўным пры стварэнні тэатралізаванай экскурсіі павінна з'яўляцца наяўнасць тэмы і ідэі, якія стваральнік дадзенай формы хоча данесці наведвальнікам музея.

1. *Андреев, Д. А.* Краеведение – основа патриотизма / Д. А. Андреев // Бюллетень медицинских интернет-конференций. – 2012. – № 11. – С. 12.

2. *Белинский, В. Г.* Избранные педагогические сочинения / В. Г. Белинский. – М. : Педагогика, 1982. – 288 с.

3. *Коменский, Я. А.* Избранные педагогические сочинения / Я. А. Коменский. – М. : Педагогика, 1982. – 656 с.

4. *Мастеница, Е. Н.* Музей в условиях глобализации / Е. Н. Мастеница // Вестн. СПбГУКИ. – 2015. – № 4. – С. 118–122.

5. *Песталоцци, И. Г.* Избранные педагогические произведения : в 3 т. / И. Г. Песталоцци. – М. : Изд-во Академии пед. наук РСФСР, 1961. – Т. 1. – 724 с.

6. *Пирогов, Н. И.* Вопросы жизни / Н. И. Пирогов // Избр. пед. соч. – М., 1985. – 315 с.

7. *Толстой, Л. Н.* Педагогические сочинения / Л. Н. Толстой. – М. : Педагогика, 1989. – 544 с.

8. *Ушинский, К. Д.* Собр. соч. : в 11 т. / К. Д. Ушинский ; редкол.: А. М. Еголин (гл. ред.), Е. Н. Медынский, В. Я. Струминский. – М. ; Л. : Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1948–1952. – Т. 2 : Педагогические статьи 1857–1861 гг. – 1948. – 656 с.

9. *Ушинский, К. Д.* Собр. соч. : в 11 т. / К. Д. Ушинский ; редкол.: А. М. Еголин (гл. ред.), Е. Н. Медынский, В. Я. Струминский. – М. ; Л. : Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1948–1952. – Т. 8 : Человек как предмет воспитания (Опыт педагогической антропологии), т. 1. – 1950. – 776 с.

*V. Mazaleuski*

**Ethic education of children in the museum environment by means of a theatrical excursion**

*The method of formation of the youth's moral values is considered. A theatrical museum excursion, during which the guide teacher creates an artistic image based on museum exhibition artifacts of the state establishment "National Historical and Cultural Museum-Reserve «Nesvizh» is proposed as one of the solution options. The exhibits that are in the museum exposition are commented with explanations related to family or personal memories, being more subjective rather than documentary. Personal memories contain a certain image of a specific historical event, like in memoir literature. Thus, the guide creates the image of a personality, historical event or cultural practice. Vocal music can be used as a theatrical element.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 31.08.2017.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ